**Заданні да аналітычнай (вытворчай) практыкі:**
(3 курс: 27.06–23.07)

За час практыкі студэнты павінны:

1. Падрыхтаваць да друку не менш за 7–10 аўтарскіх матэрыялаў у адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй, з якіх 3–5 павінны мець праблемна-аналітычны характар.
2. Працаваць у якасці карэспандэнта, дублёра, дзяжурнага па нумары, дублёра выпускаючага.
3. Дзяжурыць па нумары газеты.
4. Удзельнічаць у якасці аглядальніка ў рэдакцыйных лятучках.
5. Удасканальваць навыкі работы ў розных камп'ютарных праграмах рэдагавання і вёрсткі друкаваных матэрыялаў.

**Формы прадстаўлення студэнтамі справаздачнай дакументацыі**

У вызначаны тэрмін пасля завяршэння практыкі студэнт прадстаўляе кіраўніку-метадысту наступную справаздачную дакументацыю:

- творчы водзыў, падпісаны рэдактарам выдання і завераны пячаткай рэдакцыі;
- справаздачу аб практыцы (пішацца па форме). У ёй указваецца: спецыфіка выдання, у якім студэнт праходзіў практыку, аспекты сумеснай работы з кіраўніком практыкі ад рэдакцыі, удзел ва ўнутрырэдакцыйнай і масавай дзейнасці газеты.

Справаздача павінна ўтрымліваць таксама аналіз пазітыўных і негатыўных бакоў работы рэдакцыі, разбор найбольш адметных эпізодаў уласнай практычнай работы, роздум аб творчых знаходках і праліках, назіранні за спецыфікай рэдакцыйных будняў, за работай вопытных журналістаў, заўвагі і пажаданні па арганізацыі прыктыкі.

- дзённік практыкі (пішацца ў адвольнай форме);
- апублікаваныя творчыя працы (у выпадку істотнай праўкі – арыгіналы работ, што дасць магчымасць меркаваць аб ступені апрацоўкі матэрыяла ў рэдакцыі);
- копіі прынятых да друку, але не апублікаваных пакуль матэрыялаў, завераныя пячаткай рэдакцыі і подпісам рэдактара;
- самастойна звёрстаныя палосы (2–3);
- спіс апублікаваных матэрыялаў на электронным носьбіце.

Уся дакументацыя павінна быць падшытая ў папцы з аформленым тытульным лістом і вопісам змешчаных дакументаў.

**ТЭРМІН ЗДАЧЫ ДАКУМЕНТАЦЫІ – 25 ЧЭРВЕНЯ 2016 Г.**